9. Прачытайце артыкул «Назвы ступеняў сваяцтва», выканайце заданне па тэме.

10. Распытайце бацькоў пра сваіх продкаў (дзеда, бабулю, прадзеда, прабабулю і г. д.) і запішыце месца і час нараджэння або гады жыцця, даведайцеся, дзе яны жылі. Складзіце (або намалюйце) радаводнае дрэва — выяву свайго радаводу па бацькоўскай лініі (вазьміце за ўзор радавод Янкі Купалы па бацькоўскай лініі).



# Алесь ПІСЬМЯНКОЎ

Не, продкі не адышлі. Яны тут і заўсёды будуць тут: як песня, якую мы атрымалі ад іх, як іхнія радасць і боль. Яны расквітаюць усмешкай на нашых вуснах, і іхні боль — гэта наш боль. І калі мы плачам — мы плачам іхнімі слязьмі.

*Уладзімір Караткевіч.*

Алесь (Аляксандр) Уладзіміравіч Пісьмянкоў (1957—2004) нарадзіўся ў вёсцы Бялынкавічы Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў рабочай сям'і. Вучыўся ў Бялынкавіцкай сярэдняй школе, пачаў рана пісаць вершы. Настаўнік мовы і літаратуры ўсяляк спрыяў развіццю ў яго паэтычных здольнасцей.

Краязнавец Віктар Арцем'еў зазначае: «Алесь Пісьмянкоў — пясняр нашага роднага краю. Ён ніколі не забываў родныя карані, сваё Прыбесяддзе з крыніцамі, якія жывілі яго талент. Ён захапляўся нават назвамі вёсак малой радзімы: "Таму й чытаю назвы вёсак, як загалоўкі мудрых кніг"».

Алесь Пісьмянкоў — аўтар зборнікаў паэзіі «Белы камень», «Чытаю зоры», кніг для дзяцей «Заўзятары», «Ласуны-веселуны», «Мы з братам». Асобныя вершы Алеся Пісьмянкова пакладзены на музыку. Верш «Продкі» напісаны ў 1992 годзе і змешчаны ў зборніку вершаў «Планіда».



Правообладатель Национальный институт образования

Патлумачце сэнс наступных выказванняў Уладзіміра Караткевіча:
а) *Чалавека няма без продкаў, народа няма без гісторыі*;
б) *Хто забыў сваіх продкаў — сябе губляе, хто забыў сваю мову — усё згубіў*.

## Продкі

Калі марнею ад нягод
І сэрцу цесна,
Я ўспамінаю радавод
І продкаў песні.

Яны ідуць за годам год
З мячом і з плугам.
О, мой нязводны род,
Ён моцны духам!

Імёны памяць берагла,
Вяла праз церні[1],
Каб я не сеяў зла,
А толькі — зерне.

Да іх іду я зноў і зноў,
Ім веру свята.
Таму й вяду сваіх сыноў
Да іх на раду[2].

1. Што гаворыць паэт пра сваіх продкаў? Якім бачыць іх жыццё?
2. Патлумачце выраз *нязводны род*.
3. Чаму продкі больш за ўсё цанілі і шанавалі працу?
4. Як вы разумееце словы: *Каб я не сеяў зла, // А толькі — зерне*? Сімвалам чаго з'яўляецца зерне ў вершы?
5. Якім павінен быць чалавек, каб быць вартым памяці продкаў? Падмацуйце свае думкі радкамі з верша.

---

[1] *Це́рні* — тут: цяжкасці, пакуты, якія сустракаюцца на жыццёвым шляху чалавека.

[2] *Ра́да* — парада, павучанне, як трэба зрабіць; тут: нарада, сумеснае абмеркаванне якіх-небудзь пытанняў.



Правообладатель Национальный институт образования

6. Чаму ў часы нягод людзі звяртаюцца ў думках да сваіх продкаў? У чым, на вашу думку, вытокі моцы і трываласці чалавека?
7. У кожнага народа ёсць свой гістарычны радавод. Прыгадайце імёны славутых беларусаў. Што вы пра іх ведаеце? Чым яны вызначыліся?
8. Раскрыйце сэнс слоў Якуба Коласа: «Толькі на ўласных каранях дае дрэва багаты плод». Як гэта выказванне можна суаднесці са зместам верша Алеся Пісьмянкова?
9. Падрыхтуйце вуснае выказванне «Я — галінка на дрэве свайго роду».
10. Вывучыце на памяць верш Алеся Пісьмянкова «Продкі».
11. Прачытайце артыкул «Радаўніца. Дзяды» і выканайце заданні па тэме.



# *Уладзімір КАРАТКЕВІЧ*

Беларусь мая, ты адзіная,
Перад кім на каленях стаю:
Мне, слузе твайму, цяжка загінуць,
Лёгка — жыць у славу тваю.

*Уладзімір Караткевіч.*

Уладзімір Сямёнавіч Караткевіч (1930—1984) — вядомы беларускі празаік, паэт, драматург, публіцыст, кінасцэнарыст. Нарадзіўся ў горадзе Орша Віцебскай вобласці. Рос цікаўным і здольным хлопчыкам, навучыўся чытаць у тры з паловай гады, а ў шэсць гадоў пачаў складаць вершы, спрабаваў пісаць апавяданні, сам іх ілюстраваў, меў выдатныя мастацкія і музычныя здольнасці.

Уладзіміра Караткевіча вабілі гістарычныя сюжэты, легенды нашага краю, гераічныя характары. Ён чэрпаў натхненне з вусна-паэтычнай творчасці, захапляўся чароўнай сілай мудрага народнага слова, маляваў мужных і самаахвярных беларусаў,



Правообладатель Национальный институт образования